Viestki542.qxd 3/30/2011 11:22 PM Page 1 (3,1)


# Весткі й Паведамленьні

**Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня**

**Viestki j Paviedamlenni**

№ 4 (542)
Красавік 2011 г.



Belarusan American Association, Inc.
P. O. Box 572, New York, NY 10113-0572

Сусьветнае сеціва: www.baza-belarus.org


# Урачыстая імпрэза ў Нью-Брансўіку

У нядзелю 27 сакавіка 2011 году ў гатэлі Гаят у г. Нью-Брансўіку, Нью-Джэрзі, прайшло сьвяткаваньне 93-х угодкаў абвешчаньня незаежнасьці БНР. Перад сьвяткаваньнем у царкве сьв. Маці Божае Жыровіцкае адбылося набажэнства ў гонар змагароў за незалежнасьць, якое адправілі сьвятары а. Андрыян і а. Зінові.

Напачатку імпрэзы ў поўнай залі прагучэў гімн ЗША, які з сэрцам і душою выканала сп-чня Вольга Казак. У сьвятле таго, як мізэрна сьпявалі гімн на апошнім Супэр-Кубку па амэрыканскаму футболу ды на шэрагу іншых амэрыканскіх імпрэзаў, цудоўны сьпеў Вольгі без сумніву вывеў бы яе ў зоркі найбольшай велічыні.

Урачыстую акадэмію адкрыў старшыня аддзелу БАЗА ў Нью-Джэрзі Юрка Азарка. Пасьля прывітаньня ён адзначыў, што мы мусім моцна паўплываць на Кангрэс ЗША ў справе працягу падтрымкі змаганьня за дэмакратыю і правы чалавека ў Беларусі праз хуткае прыняцьцё Акту аб Дэмакратыі ў Беларусі-2011. У гэтым Акце, які прапанаваў кангрэсмэн Крыс Сьміт, мяркуецца поруч з дапамогаю ў аднаўленьні дэмакратыі ўвесьці новыя санкцыі супраць правячага рэжыму і запатрабаваць ад Лукашэнкі адказу за зьніклых падчас ягонага кіраваньня палітыкаў і журналістаў.

Сп-чня Настасься Мураўёва прачытала Дэклярацыю ад губэрнатара штату Нью-Джэрзі Крыса Крысты, у якой ён аб’явіў дзень 25 сакавіка Днём 93-х угодкаў незалежнасьці Беларусі ў штаце Нью-Джэрзі і адзначыў важкі ўклад беларускай супольнасьці ў грамадзкае і эканамічнае жыцьцё штату. Дзяўчаты Юля і Вольга прачыталі па-ангельску віншаваньні ад сэнатара Робэрта Мэнэндэса і кангрэсмэна Раша Голта.

Айцец Зінові прамовіў з нагоды беларускага нацыянальнага сьвята, прачытаў малітву і блаславіў ежу. Пасьля гэтага прысутныя мелі нагоду пакаштаваць страваў сьвяточнага буфэту і падняць келіх за вольную і незалежную Беларусь, змаганьне за якую яшчэ працягваецца.

Затым з прывітаньнем ад Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА выступіў старшыня Віталь Зайка. Ён павіншаваў прысутных з найвялікшым нацыянальным сьвятам і пажадаў здароўя, дабрабыту і сілаў для грамадзкай працы, а таксама аптымізму і ўпэўненасьці ў посьпеху агульнай справы.

Былі зачытаныя прывітаньне старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілла, а таксама гістарычныя 3-я грамата Рады БНР.

Сп. сп. Славамір і Сьветавіт Сокалавы прачыталі віншаваньне ад сэнатара Ляўтэнбэрга і сэнацкую рэзалюцыю № 105, ім спансаваную, дзе асуджаецца тэрор і перасьлед апазыцыі рэжыму ў Беларусі.

Затым з рэфэратам, прысьвечаным сувязі Акту 25 Сакавіка з сучаснай грамадзкай дзейнасьцю беларускай грамады, выступіла старшыня гуртка БАЗА ў Вашынгтоне (акруга Калюмбія) сп-чня Алеся Кіпель. Яна спынілася на дзейнасьці беларусаў у Вашынгтоне, а таксама на кантактах з фэдэральнымі ўладамі і прывяла прыклады шматлікіх сустрэчаў прадстаўнікоў БАЗА з урадоўцамі ДзяржДэпартамэнту, Кангрэсу і Сэнату ЗША.

З прывітаньнем да прысутных і з сваімі развагамі пра сьвяткаваньне 25 Сакавіка ў Зах. Беларусі, пра ролю моладзі ў нацыянальным руху і пра падзеі Другой сусьветнай вайны датычна беларускай нацыянальнай справы выступіў вэтэранаў беларускага руху і БАЗА, былы Старшыня Галоўнай управы сп. Антон Шукелойць, які сёлета адзначае 80-я ўгодкі сваёй грамадзка-палітычнай дзейнасьці.

Сп. Юрка Азарка прачытаў прывітаньне ад кангрэсмэна Ф. Палонэ, у чыёй кангрэсовай акрузе знаходзіцца царква

*Заканчэньне на бачыне 4*



Viestki542.qxd 3/30/2011 11:22 PM Page 3 (1,1)



# Сакавіцкі сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА

У суботу, 12 сакавіка, прайшоў сакавіцкі сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Чарговы сход у Доме Маракоў пазначыў амаль ужо год, як аддзел ня можа склікаць сходы ў Фундацыі імя П. Крэчэўскага, дзе больш як 40 год праводзіліся сходы, а таксама іншыя імпрэзы аддзелу.

Напачатку сакавіцкага сходу старшыня аддзелу Віталь Зайка азнаёміў прысутных з апошнімі падзеямі ў Беларусі й зьвязанымі зь Беларусьсю. Сярод іх былі ўзгаданыя суды над арыштаванымі за ўдзел у акцыі пратэсту 19 сьнежня 2010 г. у Менску, падрыхтоўка рэзалюцыі Кангрэсу ЗША па Беларусі (спонсары Дурбан, Лібэрман, Макэйн, Кардын) з асуджэньнем вынікаў выбараў і прадстаўленьнем падтрымкі апазыцыі й мераў або санкцыяў супраць прадстаўнікоў рэжыму Лукашэнкі. Таксама было ўзгадана, што віцэ-прэзыдэнт Джо Байдэн падчас візыту ў Кішынёве заклікаў беларускія ўлады вызваліць усіх палітвязьняў.

Затым сп. Віталь Зайка і сп-ня Валя Якімовіч распавялі пра новую кнігу паэта Рыгора Барадуліна, што гатовая да друку, але дзеля браку сродкаў ня можа быць выдадзеная. На просьбу зь Менску, якая паступіла ад рэдактара кнігі, Нью-Ёрскі аддзел БАЗА пагадзіўся дапамагчы ў зборы сродкаў.

Сп. Валя Якімовіч, што асабіста ведае сп. Рыгора Барадуліна, распавяла пра ягонае жыцьцё і творчы шлях. Яна ўзгадал, што паэт шмат піша пра важнасьць захаваньня сваёй мовы. Па словах Р. Барадуліна, мова ёсьць найважнейшым чыньнікам нацыянальнага паяднаньня, і "бяз мовы ад нашай краіны застануцца толькі бурбалкі". Затым прагучалі вершы Рыгора Барадуліна дэклямаваныя В. Якімовіч і В. Зайкі. Сп. Зайка адзначыў, што новая кніга Р. Барадуліна прысьвечаная ўзаемадзеяньню беларускай і гэбрайскай культураў у Беларусі, і ўяўляе сабою годную і вартую справу, якая служыць умацаваньню беларускай сьвядомасьці й сьветагляду (і акурат дзеля гэтага ня можа спадзявацца на падтрымку сёнешніх уладаў). Прамоўца коратка спыніўся на гісторыі гэбраяў Беларусі й беларуска-гэбрайскіх узаемаадносінаў і заклікаў прысутных дапамагчы праекту.

Сп-ня Якімовіч распавяла пра сваё ўспрыняцьце гэбрайскай паэзіі і прачытала вершы паэта Гірша Рэлеса, які пісаў пра Беларусь з такім лірызмам і адданасьцю, што не заўсёды сустракаюцца ў іншых паэтаў.

Затым адбыліся знаёмствы з гасьцямі аддзелу, прагучэлі аб'явы й паведамленьні. Сп. Дзяніс Таўпека распавёў пра "беларускі дзень" на Нью-Ёрскім кінафэстывалі, дзе будуць прадстаўленыя два беларускія фільмы.

***Віталь ЗАЙКА***

# Прэзэнтацыя новых кнігаў Зянона Пазьняка

Старшыня Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне" Зянон Пазьняк правёў 27 лютага 2011 году ў грамадзкай залі пры саборы сьв. К. Тураўскага ў Брукліне прэзэнтацыю сваіх трох новых кнігаў.

Першая называецца "Дэпутаты незалежнасьці". Гэтая кніга пра дэпутатаў апазыцыі Беларускага Народнага Фронту ў Вярхоўным Савеце XII скліканьня. Пра людзей, якія здабылі незалежнасьць для Беларусі. У кнізе ёсьць партрэты, біяграфіі і апісаньне кожнага ўдзельніка. Акрамя таго ў ёй зьмешчаныя артыкулы аўтара і Сяргея Навумчыка пра дзейнасьць апазыцыі ў 1990-х гадох, пра барацьбу за беларускае нацыянальнае войска, за беларускія грошы, грамадзянства. Гэтыя падзеі цяпер замоўчваюцца рэжымам.

Друга кніга – гэта "Дэклярацыя – першы крок да незалежнасьці", дзе апісаныя падзеі прыняцьця дэклярацыі.

І яшчэ адная кніга, што ёсьць другою часткаю другога тому канцэпцыі Новага Беларускага Адраджэння. Першая частка другога тому была прэзэнтавана летась. Першы том называецца "Развагі", другі – "Цяжкі час". Усяго будзе чатыры тамы. У кнізе, што была прэзэнтаваная, сабраныя дакумэнты, артыкулы і фатаграфіі з 2002 па 2006 год".







Прысутныя маглі задаць пытаньні аўтару, атрымаць на іх адказы і падзяліцца сваімі думкамі.

Пасьля прэзэнтацыя адбыўся прагляд новага фільму беларускага рэжысэра Юрыя Хашчавацкага.

***Прысутны***



Viestki542.qxd 3/30/2011 11:23 PM Page 3 (3,1)



# Гуканьне вясны ў ваколіцах Нью-Ёрку

Новы год у нашых продкаў пачынаўся вясною. Зь першага веснавога месяца звычайна бярэ пачатак і сельскагаспадарчы працоўны год. Поры году ўспрымаліся як прыход жывых багоў і багінь, што па чарзе ўладараць на зямлі пэўны тэрмін.

Вобраз Пяруна ў беларускім фальклёры часта праходзіць як Вялікі Бог Грымотнік, што сваім жыцьцядайным нябесным агнём ажыўляе мёртвыя зямныя воды Вялікай Багіні Мары. Ад гэтых дзеяньняў нараджаецца сын Сварога Сонца, якога наракаюць Дажбогам. Галоўнымі атрыбутамі сына Сварога – Сварожыча або сьветлага сонца Дажбога былі конь і дзіда, а таксама, вялізны дзік (вепр), які выходзіў з мора, бо яго прынята лічыць заамарфным сымбалем сонца.

Паводле некаторых мітаў, Марэна выступае жонкаю Пяруна. У іншых крыніцах яна лічыцца сястрою Грымотніка-Пяруна. Як пісалі яшчэ ў пятнаццатым стагодзьдзі: ‘’Пярун есть мног’’, таму і Ярыла разглядаўся адною з іпастасяў Пяруна ці ягоным сынам.

Міталягічныя істоты з імём Мара ці падобным яму вядомыя ў славянаў, балтаў, грэкаў, германцаў і шэрагу іншых народаў. Мяркуецца, што такім імём на пачатку ўзьнікненьня пантэону называлі архаічную Вяліку Багіню, апякунку як наражэньня, так і сьмерці. Асноўныя рысы паганскай багіні Мары сумясьціла ў сабе сьвятая Кацярына, што ў паданьнях характарызуецца як частка ніжняга сьвету. Старажытная апякунка вады, каханьня і шлюбу магла фігураваць пад імёнамі Марыя, Марэя, Мархва, якія можна супаставіць з Мар’яй – Марай, а таксама пад імёнамі Кацярына, Мар’я, Марына, Ульляна, (Вельяна), Куліна, Сьцепаніда.

Нельга выключыць, што адныя і тыя ж багі беларускага пантэону ў розных запісах фігуруюць пад рознымі імёнамі. Апрача таго, кожная багіня магла мець сэзонныя іпастасі і мясцовыя лякальныя назвы.

У беларускім фальклёры фігуруе Пярун-Ільля-Купаліш-Іван, ці Пярун-Ярун-Ярыла–Юр’я. І, відавочна, генэтычна зьвязаныя Мара-Мар’я-Купала-Кацярына, альбо Жыва-Мокаш-Параскева-Лада-Божая маці.

Чалавечая дзейнасьць сугучная рытмам прыроды. Абрады ў каляндарным цыкле ўтрымліваюць галоўную сэнсавую ідэю: узьвелічэньне росквіту прыроды і імкненьне ўздзейнічаць на яе. Праз усе абрады праходзіць ідэя ўзнаўленьня роду, самога чалавека. Таму тэма каханьня ёсьць найважнейшаю.

Жыву – багіню вясны, жыцьця і часу – уяўлялі прыгожаю і добраю дзяўчыкальнікаў і птушак, якія на наш покліч мусілі б прыляцець. Прыгатавалі грыбны квас і кампот. Быў на нашым застольлі і хлеб, і пірог з макам.



наю, якая сваім прыходам жывіла памерлую зімою прыроду, давала ёй плоднасьць, ад яе залежаў дабрабыт чалавека. Таму быў вельмі важным цыкл вясновых сьвятаў: Гуканьне вясны, Вялікдзень, Юр’я, Пахаваньне ці Ваджэньне стралы.

Абрадам, які пачынаў вяснавы цыкл, было Гуканьне вясны. Яно адзначалася зь 1 сакавіка да 25 сакавіка.

Побач з радасьцю ажыўленьня ўсяго існага гучыць асноўны матыў абрадаў – ахоўны. Таму ў час гуканьня вясны спальваецца альбо пускаеца па рацэ на падпаленым плоціку пудзіла лялькі-Мары, што ўвасабляе сабою зіму, якая нібы ў сьмяротны сон закоўвала ўсю прыроду. А праз зьнішчэньне лялькі-Марэны можна было спадзявацца на росквіт прыроды, добры ўраджай і новае жыцьцё.

Гуканьне вясны – гэта абрад пакланеньня Сонцу. Вось і мы, беларусы, каго лёс закінуў далёка ад радзімы, вырашылі правесьці гэты абрад ня так далёка ад Мангэтану ў мястэчку Осэнін на беразе ракі Гудзон. Сям’я Алены і Пятра Рыжых прыклала шмат намаганьняў дзеля гэтага. Пятро замовіў клюб-хатку на самым беразе, падрыхтаваў харчы. Маці трох мал-мала-меньшых сыночкаў Алена напякла смачненных бліноў, што сымбалізуюць сабою сонца, патраціўшы на гэтую справу ледзь ня цэлы дзень. Прыгатавала гуляш і аб’ядзеную кашу з грэчкі, каб накарміць загу-

Сабраліся апаўдні. Спачатку падсілкаваліся, апрануліся ў строі. Выйшлі на падворак. Неба хмурылася шэрымі хмаркамі. Няўтульна дзьмуў вільготны і халодны паўночны вецер. Замацавалі каля разгалістага дрэва трох птушак, зробленых Аленкаю і мною позьнімі начамі з травы, бо саломы не было дзе ўзяць. Па-добраму, трэ было б распаліць вогнішча, каб спаліць у ім непатрэбныя старыя рэчы, а потым і Марэну, але на гэта мы ня мелі дазволу. Сталі ў кола вакол птушак. Я распавяла пра абрад, бо можа нехта пра гэтую добрую традыцыю ўпершыню даведаўся менавіта тут, у Нью-Ёрку. Павялі карагод па сонцу. Я запявала, а загукальнікі працягвалі рэфрэнам. Гулялі ў гульні, потым, сьпяваючы, карагодзілі ручайком і ў выглядзе арнамэнту, зноў па сонцу. На завяршэньне абраду нашую Марэну мы кінулі ў воды Гудзону.

Як бы ў адказ нашым песьням, якія мы завяршалі своеасаблівым прыпевам: ‘’Гу-у-у!’’, уздымаючы рукі ў гару, пасылаючы гукі ў касьмічную прастору, вецер суняўся, і выглянула сонейка. Стала цёпла і ўтульна. На разьвітаньне перад дарогаю падсілкаваліся стравамі, прыгатаванымі сям’ёй Рыжых, яшчэ раз. Настрой быў цудоўны. Разыходзіцца не хацелася. Было шчыра шкада тых, хто па нейкіх прычынах не далучыўся да нас, прасядзеўшы дзень сярод нью-ёрскіх гмахаў.

***Валянціна ЯКІМОВІЧ***

## Шаноўнае спадарства!

Нагадваем, што **31 траўня 2011 г.** заканчваецца тэрмін збору твораў для чарговага, пятага па ліку, літаратурнага альманаху беларускіх пісьменьнікаў замежжа **“БЕЛАРУС”** за 2011 год.

Зьмясьціць свае творы ў альманаху могуць аўтары, якія пішуць па-беларуску ў самых розных літаратурных жанрах. Адзінае патрабаваньне – аўтары павінны жыць па-за межамі Беларусі.

Плануемы час выхаду літаратурнага альманаху ў сьвет – **жнівень 2011 году**.

Свае творы аўтарам найлепш дасылаць электронную поштаю на адрас: ***hazetabielarus@att.net***

Калі аўтары ня маюць доступу да сусьветнага сеціва, творы можна дасылаць поштаю запісанымі на CD ці DVD альбо надрукаванымі на паперы на адрас рэдакцыі: ***BIELARUS***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735 USA***

Творы, напісаныя наркомаўкай, у альманаху будуць надрукаваныя тарашкевіцай.

Кожнаму аўтару, хто вырашыць даслаць свае творы, пажадана таксама даслаць свой партрэтны здымак і кароткую аўтабіяграфію і, калі захочуць, дадатковую інфармацыю пра сябе, якую яны хацелі б паведаміць сваім чытачам.

З пытаньнямі кантактуйце рэдакцыю.




# Імпрэза ў Нью-Брансўіку

сьв. Маці Божае Жыровіцкае. Ф. Палонэ меўся ўзяць удзел у нашай імпрэзе, але ў апошні момант адмяніў візыт дзеля таго, як ён патлумачыў па тэлефоне сп. Азарку, каб выступіць на тэлеканале Fox News з камэнтарамі з нагоды дзеяньняў прэзыдэнта Абамы й бамбаваньня Лібіі.

Затым адбыўся сьвяточны канцэрт, у якім выдатна выступілі Валянціна Пархоменка, Вольга Казак і Алесь Казак разам з музыкаўнаўцам Зьмітром Сьляповічам, які цудоўна зайграў на клярнэце і саксафоне і выканаў свае песьні. Прысутныя былі ў захапленьні ад вытупу непараўнальнай Валянціны Пархоменкі і ад песьняў Вольгі Казак “Белая-белая”, “Вясна-красна” і шмат іншых у выкананьні нашых славутых артыстаў.

Асаблівая падзяка належыцца сп-ні Валянціне Якімовіч за арганізацыю паказу беларускіх нацыянальных строяў, якія прыгожа прадэманстравалі беларускія юнакі й дзяўчаты. Гэта цудоўна аздобіла імпрэзу, дадало ёй маладзёвай жвавасьці, віраваньня і прамяністасьці.

Таксама вялікая падзяка Беларускаму Музэю ў Нью-Ёрку, што прадставіў выставу карцінаў мастака Алеся Шатэрніка і вышываныя абразы Любові Карпавай.

Для падрыхтоўкі імпрэзы шмат папрацавалі таксама сп. сп. Юрка Азарка і Янка Грышкеіч.

Тыя, з кім была нагода пагутарыць аб імпрэзе, казалі што сьвяткаваньне прайшло вельмі ўдала, адзначалі добрую арганізацыю і тое, што сярод прысутных было шмат моладзі.

***Віталь ЗАЙКА***

## Папраўка да нэкралёгу сьв. пам. Барыса Данілюка

Барыс Данілюк падчас Другой сусьветнай вайны працаваў у аддзеле адукацыі ў Слоніме, але ня быў школьным інспэктарам, як пададзена ў нэкралёгу, а таксама не кіраваў мастацкай самадзейнасьцю ў Слоніме, але браў у ёй удзел. Хоць скончыў спартовыя курсы СБМ у Менску, але ня быў інструктарам. У Амэрыку перабраўся не ў 1950, а ў 1951 годзе.

Просім прабачыць за памылкі.

### Уплаты ў Нью-Ёрскі аддзел БАЗА
Складкі й ахвяраваньні:

Г. Астапук ..................... 50
А. Ахмяненка ................... 50
А. Бандаровіч .................. 50
А. Гусак ....................... 50
А. Дзянісавец .................. 50
А. Дубавая ..................... 50
П. Мішкін ...................... 50
К. Цэрашковіч .................. 50
А. Цьвікевіч ................... 50

**Усім шчыры дзякуй!**

### Уплаты ў аддзел шліце на адрас:
*Belarusan American Association*
*P. O. Box 572*
*New York, NY 10113*
**Чэкі выпісвайце на**
*Belarusan American Association.*

*Шаноўныя сябры!*
*Калі Вы атрымліваеце бюлетэнь **“Весткі й Паведамленьні”** як сябар Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА, але яшчэ не рабілі ахвяраваньняў на ягонае выданьне, калі ласка, паведаміце рэдакцыі (поштаю ці праз е-мэйл) аб жаданьні атрымліваць бюлетэнь і, па магчымасьці, падтрымайце выданьне фінансава.*

## НАСТУПНЫ СХОД

Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца **ў суботу**, **9-га красавіка 2011 г.** на Мангэтане.

Месца правядзеньня сходу:

***Seafarers and International House***
***123 East 15th Street***
***New York, NY 10003.***

*Даезд цягнікамі падзземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да станцыі **Union Square**.*

*Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Union Square па 15-й вуліцы на скрыжаваньні з Irving Place.*

**Красавіцкі сход пройдзе ў капліцы на 1-м паверсе, а ня ў залі на 2-м паверсе, як бывала раней. Капліца знаходзіцца справа ад ўваходу.**

Пачатак сходу: **а 6:00-й** вечара.

-------------------

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА ды іншых імпрэзаў, ладжаных аддзелам, можна даведацца, наведаўшы ўэб-старонку **www.baza-belarus.org***

### Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

Ю. Лісоўская ................... 50
А. Радзюк ...................... 50
Г. Астапук ..................... 30
А. Ахмяненка ................... 30
А. Бандаровіч .................. 30
А. Дзянісава ................... 30
А. Дубавая ..................... 30
А. Гусак ....................... 30
П. Мішкін ...................... 30
В. Пасько ...................... 30
А. Русецкая .................... 30
К. Цэрашковіч .................. 30
А. Цьвікевіч ................... 30

**Шчыры дзякуй!**

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы ў рэдакцыю аплату гадавой падпіскі (**$30**). Чэкі выпісвайце на імя **Belarusan American Association**.*
*Рэдакцыю бясплатна надрукуе прыватныя некамэрцыйныя абвесткі, а таксама будзе ўдзячная за дасланыя водгукі й лісты.*
*Допісы ў рэдакцыю накіроўвайце на адрас:*
***VIESTKI***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***
*альбо на адрас электроннай пошты:*
***viestki@mail.com***

*У сеціве электронны варыянт бюлетэня можна знайсьці па адрасу:* ***www.e-krama.com***